# ВУЧОНЫЯ БЕЛАРУСІ ЗАКЛІКАЮЦЬ ДА СПЫНЕННЯ БУДАЎНІЦТВА ПАМЕЖНАЙ АГАРОДЖЫ І РАЗБУРЭННЯ ЭКАЛАГІЧНЫХ СІСТЭМ БЕЛАВЕЖСКАЙ ПУШЧЫ

Белавежская пушча – унікальны аб’ект запаведнай прыроды Еўропы, які мае выключнае прыродаахоўнае значэнне і знаходзіцца пад ахоўвай закона з пачатку XV стагоддзя.

Багацце Пушчы – тысячы стараўзроставых дрэў, сотні відаў раслін і жывёл, у тым ліку найбольш шматлікая ў свеце папуляцыя зуброў.

Белавежская пушча ўнесена ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА і прадстаўлена ў ім як адзіны прыродны аб’ект, размешчаны на трансгранічнай тэрыторыі Беларусі і Польшчы. Унікальнасць і выключнае прыродаахоўнае значэнне пушчы заключаецца, у першую чаргу, у яе маштабах і відавой разнастайнасці. Для жывёл не існуе межаў, беларуская і польская часткі папуляцый функцыянуюць як адзінае цэлае, мігруючы ў межах усёй тэрыторыі пушчы.

Акрамя знаходжання ў Спісе сусветнай спадчыны ЮНЕСКА Белавежская пушча мае яшчэ шэраг міжнародных прыродаахоўных статусаў:

- біясферны рэзерват ЮНЕСКА (1993 год);
- Еўрапейскі дыплом для ахоўных прыродных тэрыторый (1997 год);
- тэрыторыя міжнароднага значэння, важная для птушак (IBA);
- ключавая батанічная тэрыторыя міжнароднага значэння (IPA);
- аб’ект Ізумруднай сеткі (Emerald network);
- водна-балотнае ўгоддзе міжнароднага значэння – Рамсарская тэрыторыя (лесабалотны комплекс «Дзікае»).

Узвядзенне памежных загарод унутры тэрыторыі пушчы акажа вялікае негатыўнае ўздзеянне на стан рэдкай экалагічнай сістэмы і пацягне за сабой: знікненне рэдкіх і ахоўных відаў раслін і жывёл у выніку знішчэння натуральнай расліннасці і біятопаў; разбурэнне месцаў пасялення жывёльнага свету; ізаляцыю асобных мікрапапуляцый з наступным іх выраджэннем (здрабненне асобін, рост марфалагічных анамалій і г.д.); парушэнне цэласнасці папуляцый дзікіх жывёл; памяншэнне генетычнай разнастайнасці дзікіх жывёл.

Вучоныя Беларусі заклікаюць урад Польшчы перагледзець сваё рашэнне аб будаўніцтве загараджальнай пагранічнай агароджы ў Белавежскай пушчы, а таксама звяртаюцца да міжнародных арганізацый, дзейнасць якіх накіравана на абарону прыроды, прыняць меры для прадухілення магчымай каласальнай шкоды ўнікальнаму прыроднаму аб’екту.

***Прэзідыум Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі***